# Старыя даследаванні з сучасным гучаннем

Выданне гэтага нумара мае на мэце адкрыць беларусам асобу і творчасць чарговага ўраджэнца нашай зямлі, які ў свой час дабіўся вялікіх прафесійных поспехаў у сваёй галіне і гэтым здабыў заслужаную пашану, але дагэтуль быў амаль невядомы на сваёй бацькаўшчыне, якую шчыра любіў і праблемам якой прысвяціў ладную частку свайго творчага жыцця. Гаворка ідзе пра польскага гісторыка Севярына Віславуха (1900—1968), які нарадзіўся на Заходнім Палессі, у міжваенны час працаваў у Віленскім універсітэце, а навуковыя і грамадскія інтарэсы якога ў даваенны перыяд былі непасрэдна звязаныя з гісторыяй і актуальным на той час станам беларуска-літоўскага краю.

Жыццёвы і творчы шлях Севярына Віславуха, а таксама ягоныя грамадска-палітычныя погляды падрабязна распісаныя ў адмысловых працах польскіх навукоўцаў, якія друкуюцца на старонках нумара. Дзеля таго ў гэтым кароткім уступным слове я спынюся толькі на тым значэнні, якія маюць для нас сённяшніх тыя тры працы ягонага аўтарства, што публікуюцца тут у перакладзе на беларускую мову. Усе яны прысвечаныя нацыянальным і сацыяльным працэсам, якія адбываліся на землях Віленшчыны і Наваградчыны на заключным этапе існавання тут польскай улады — другой палове 1930-х гг.

Увогуле для неабыякавай да гістарычных праблем часткі беларускага грамадства тэма жыцця беларусаў у складзе міжваеннай польскай дзяржавы — гарачая і кантраверсійная. Рэгулярна прынамсі некалькі разоў на год (з асаблівым абвастрэннем 17 верасня) у перыядычным друку, на форумах і ў сацыяльных сетках разгортваюцца з гэтай нагоды гарачыя дыскусіі. У ходзе іх, у залежнасці ад ідэалагічных установак дыскутантаў, праяўляюцца розныя пазіцыі, у тым ліку і крайнія: ад поўнай дэманізацыі міжваеннай Польшчы да яе надзвычайнай ідэалізацыі. Прытым часта паленіка вядзецца толькі на ўзроўні эмоцый, не падмацоўваючыся глыбокім веданнем спецыфікі тагачаснага жыцця.

Чым жа на самай справе была для беларусаў міжваенная Польшча (у польскай тэрміналогіі «ІІ Рэч Паспалітая») — строгай, але справядлівай маці ці злоснай мачыхай? Як ставіліся да дзяржавы, якой былі грамадзянамі, продкі многіх з нас канкрэтна ў тыя часы (бо вядома, што на ўспаміны, занатаваныя праз шмат гадоў, звычайна робіць моцны ўплыў перажытае пазней)? Ці справядлівае нярэдка сёння сустраканае меркаванне, што калі б польская дзяржаўнасць на захадзе Беларусі патрывала крыху даўжэй, то ніякіх беларусаў сёння там ужо не было б, бо асіміляцыйная палітыка польскіх уладаў была

надта эфектыўная ды паспяховая? Як увогуле працякалі працэсы нацыянальнага ўсведамлення беларускамоўных «тутэйшых» сялянскіх масаў, якая тады пераважна была нацыянальная свядомасць і якая была (і ці была) дынаміка яе змены?

Трэба сказаць, што ўсе гэтыя пытанні цікавяць не толькі нас сённяшніх — не давалі яны спакою і многім прадстаўнікам тагачаснай польскай інтэлігенцыі. Адной з найбольш вядомых да сённяшняга дня працай, у якой змяшчаюцца рэфлексіі на падобныя тэмы, з'яўляецца зборнік рэпартажаў віленскага пісьменніка і публіцыста, супрацоўніка выдання віленскіх кансерватараў «Słowo» Юзафа Мацкевіча пад назвай «Бунт ройстаў», што выйшаў у 1938 г.[1] Кніга выклікала цікавасць сярод тагачаснага польскага грамадства, рэцэнзіі на яе з'явіліся як у мясцовых, так і цэнтральных выданнях. Па выніках прачытання кнігі адзін з рэцэнзентаў, вядомы ў той час сталічны публіцыст Караль Збышэўскі, канстатаваў:

> *Мала, а ў шматлікіх выпадках абсалютна нічога Польшча не дае «крэсоваму» насельніцтву — акрамя «бастыёнаў культуры» ў выглядзе аддзяленняў паліцыі, Корпуса аховы памежжа і секвестратараў!* [...] *«Бунт ройстаў» рассейвае шмат ілюзій, прышчэпленых нам праз паведамленні Польскага тэлеграфнага агенцтва, паказвае ж нам сумныя, бедныя, сектанцкія, расчараваныя «крэсы» такімі, якімі яны ёсць сапраўды*[2].

Гэткія самыя словы з поўным правам можна сказаць і пра ўжо не публіцыстычныя, а навуковыя працы Севярына Віславуха — і яны, вядома, былі б сказаныя, калі б рэцэнзенты мелі магчымасць у той час з імі азнаёміцца. Варта адзначыць, што ўвогуле ў той час не толькі грамадскасць, апазіцыйна настроеная ў дачыненні да тагачасных уладаў, ставіла пад сумнеў паспяховасць ранейшай дзяржаўнай «крэсовай» палітыкі і не дазваляла сабе расслабіцца. У асяродках самой улады таксама ўзрастала разуменне таго, што рэальная карціна можа быць значна адрознай ад той, якая прадстаўлялася грамадству афіцыйна. Дзеля таго, уласна кажучы, калектыву пад кіраўніцтвам Севярына Віславуха дзяржаўнымі органамі і было замоўлена адмысловае даследаванне, анкетныя і іншыя матэрыялы для якога былі сабраныя ў асноўным у 1936—1938 гг. Даследаванне ахапіла большую частку тэрыторый Віленскага і Наваградскага

1 Mackiewicz J. Bunt rojstów. Wilno, 1938. Кніга да гэтага часу вытрымала некалькі перавыданняў, апошняе з якіх: Mackiewicz J. Bunt rojstów. Londyn, 2011. Ройсты — гэта забалочаныя, зарослыя чаротам мясціны.

2 Zbyszewski K. W długich butach po błocie // Prosto z Mostu. 1938. 13 lutego. Nr 9. S. 2.

ваяводства, і падчас яго былі грунтоўна абследаваныя больш за чатыры сотні населеных пунктаў ва ўсіх паветах рэгіёна (сітуацыя ў кожнай з іх разглядаецца ва ўсіх працах канкрэтна, не губляючыся ў агульнай масе). Вынікам сталі тры навуковыя працы, дзве з якіх былі выдадзеныя пад грыфам «сакрэтна» незадоўга да выбуху Другой сусветнай вайны[3], а трэцяя (фактычна абагульняльная) была дапрацаваная Севярынам Віславухам ужо ва ўмовах новай акупацыі Польшчы нямецкімі і савецкімі войскамі, доўга ляжала ў рукапісе і дачакалася першапублікацыі толькі некалькі гадоў таму[4]. Няма сумневу, што калі б гэтыя працы сталі даступныя для шырокай грамадскасці ў той час, як былі напісаныя, то выклікалі б вялікую зацікаўленасць і далі б пачатак шырокай дыскусіі адносна нацыянальнай палітыкі польскай дзяржавы. Сталася, аднак, так, што доўгі час гэтыя каштоўныя матэрыялы былі амаль незапатрабаваныя, хоць з часам іх вартасць як гістарычнай крыніцы толькі павялічвалася, бо на старонках прац Севярына Віславуха аказаўся амаль фатаграфічна зафіксаваны той стан рэчаў, які грунтоўна і незваротна змяніўся ўжо праз некалькі гадоў.

З выданнем гэтага нумара «ARCHE» ўсе тры вышэйзгаданыя працы ўпершыню робяцца даступныя і беларускаму чытачу. Цікавую для сябе інфармацыю тут несумненна знойдуць не толькі прафесійныя даследчыкі з розных галін гуманітарных навук, але і краязнаўцы, ды і проста зацікаўленыя мінуўшчынай жыхары адпаведных рэгіёнаў. Прытым уважлівае і ўдумлівае чытанне гэтых матэрыялаў можа даць ключ не толькі да лепшага разумення гісторыі, але і да многіх праблем нашага сучаснага жыцця.

*Аляксандр Пашкевіч*

[3] Wysłouch S. Polacy i Białorusini-katolicy na terenie Wileńszczyzny. Warszawa, 1938; Wysłouch S. O świadomości ludności prawosławnej zamieszkującej wschodnie i północno-wschodnie powiaty Wileńszczyzny. Warszawa, 1939.

[4] Wysłouch S. Stosunki narodowościowe na terenie województw wschodnich. [Wilno 1939/40]. Warszawa, 2013.